**Праект «Вывучаем родны край»**
**Творчая справаздача**

**Л. В. Радзіон,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі

**Мэта**: выхаванне ў дзяцей цікавасці і павагі да гісторыі, традыцый свайго роднага краю.

**Задачы**:

- прадставіць вынікі даследаванага матэрыялу па тэме праекта, папоўніць летапіс паселка новым матэрыялам;
- фарміраваць пачуццё гонару за свой пасёлак і яго людзей;
- развіваць у вучняў пазнавальныя навыкі, творчыя здольнасці.

**Форма**: віртуальнае падарожжа.

**Абсталяванне**: інтэрактыўная дошка, камп'ютар, дрэва памяці, заданні групам, папкі з матэрыялам па тэме праекта.

**Этапы падрыхтоўкі:**

1) абмеркаванне тэмы праекта, вызначэнне асноўных кірункаў даследавання;
2) вызначэнне канчатковага рэзультату праекта;
3) стварэнне груп і размеркаванне абавязкаў;
4) стварэнне банка ідэй;
5) збор матэрыялу, кансультаванне;
6) калектыўнае абмеркаванне выкананай работы;
7) абарона праекта (творчая справаздача).

***Эпіграф***

*У падзеях мінулага – нашы карані.*
*А дрэва без карэння не можа ні існаваць, ні тым больш прыносіць плады.*
*У. Караткевіч*

**Ход мерапрыемства**

1. **Уступ. Слова настаўніка**

***Настаўнік.*** Старажытныя грэкі казалі, што добры настрой – палова перамогі. Таму жадаю добрага настрою, поспеху і цікавага падарожжа ў мінулае.

Даўно вядома: калі са студні не чэрпаць, то яна перасохне, заплыве глеем. Сёння мы сабраліся разам, каб прыйсці да крыніцы, што ўжо некалькі стагоддзяў жывіць, сілкуе нашу памяць. Памяць – гэта наша гісторыя. Ведаеце, рабяты, яшчэ ў крывічоў існаваў звычай: калі юнак не ведаў продкаў да пятага калена, то ён не меў права звацца мужчынам. Такому

чалавеку не давяралі, яго наогул маглі выгнаць з паселішча, бо лічылася, што бяспамятны лёгка зробіцца здраднікам.

А У. Караткевіч пісаў: *У падзеях мінулага – нашы карані. А дрэва без карэння не можа ні існаваць, ні тым больш прыносіць плады.*

Сёння мы творча прадставім вынікі працы над праектам «Вывучаем родны край». На працягу года наш клас працаваў над зборам матэрыялу па вывучэнні гісторыі пасёлка Наваельня. Пра самыя цікавыя факты мы раскажам у нашай справаздачы. А яшчэ мы створым сваё дрэва памяці.

Асноўная наша задача: папоўніць летапіс паселка новым матэрыялам.

***Стук у дзверы, заходзяць карэспандэнты школьнай газеты «Наш край».***

<u>*Дыялог:*</u>

- *Заходзьце, калі ласка!*
- *Добры дзень!*
- *Добры дзень!*
- *Выбачайце, калі ласка, што спазніліся,запрацаваліся.*
- *Тэрмінова рыхтуем чарговы нумар газеты «Наш край». Дакладней, усё, закончылі.*
- *Без нас у класе не абыходзіцца ніводная важная падзея, мерапрыемства. Вось і да гэтай справаздачы мы рыхтавалі відэафільм, які прысвечаны гісторыі роднага пасёлка.*
- *А сёння наша задача – стварыць рэпартаж, матэрыялы якога будуць размешчаны на сайце школы.*
- *Ну а зараз вашай увазе прапануем відэафільм «Гісторыя нашага пасёлка».*

***Настаўнік.*** Папросім карэспандэнтаў заняць свае месца за сталом, у час працы вы можаце задаваць пытанні, рабіць фотаздымкі.

***Відэафільм, музыка, дзеці агучваюць.***

***Настаўнік.*** Кожная мясціна на свеце ганарыцца нечым сваім, адмысловым. Сасновы бор, рака, возера, начныя гукі, крыжы-заступнікі, невядомыя насыпы заўсёды вабяць нейкаю магічнаю сілаю. Нашы продкі пакінулі шмат фантастычных апавяданняў на розныя тэмы. Група фальклрыстаў збірала матэрыял «Легенды і паданні Наваяльнянскай зямлі». Папросім іх расказаць пра вынікі сваёй працы.

***Выступленне фалькларыстаў.*** На працягу трох месяцаў намі праводзілася пошукавая і даследчая работа. Мы сустракаліся з мясцовымі жыхарамі, запісвалі легенды і паданні. Акрамя гэтага, працавалі ў школьным гісторыка-краязнаўчым музеі, а таксама ў бібліятэках пасёлка. Вялі

актыўную даследчую працу, а таксама спрабавалі сябе ў ролі складальнікаў легенд, выказвалі сваё бачанне гістарычных падзей нашай мясцовасці.

У выніку ў нас атрымаўся зборнік легенд «Таямніцы малой Радзімы», матэрыялы якога можна выкарыстоўваць як на ўроках, так і на класных гадзінах. А зараз мы вам прадставім інсцэніроўку.

***Інсцэніроўка.***

Даўным-даўно ў цёмным лесе
Жыў у маёнтку пан стары.
Памешан быў на ўласным лёсе
І верыў у прыкметы без пары.

І вось аднойчы на кірмашы
Цыганка пану наўздагон,
Вяшчунскім гонарам аб’ята,
Згадала ад лясоў палон.

«Ты маеш шмат лясоў вакол,
Ты прагны, крыўдны, баязлівы.
Бандыты з лесу возьмуць кол,
І будзеш ты ўжо ў магіле».

Ахамянуўся пан стары,
Цыганкі след прастыў у натоўпе,
І загадаў ён: «Усе лясы
Спіліць, прадаць, спаліць раптоўна».

Сядзіба ў заняпад прыйшла,
Ад пана людзі паўцякалі.
А праз пару гамонка йшла,
Што пана ў жывых не стала.

На гэта месца, у маёнтак,
Прыехаў паніч малады.
Ён адрадзіў кругом усё так,
Што люд вярнуўся на двары.

Узняўся ельнік круг сядзібы,
Грыбоў і ягад людзям даў.
І з той пары Новаю Ельняй
Маёнтак называцца стаў.

Народ наш слаўны і руплівы,
Не падкі да высокіх слоў.

І праз гады Новая Ельня
Жыла – расла сярод лясоў.

Ішлі гады, як пыл скрозь пальцы,
Змянілі хвойкі ельнік той,
А Наваельня на Маўчадцы
Квітнее ўсё сама-сабой.

Смяюцца дзеці каля школы,
Працуюць і завод, і клуб.
І Новай Ельні (Наваельні)
Мне мілы кожны-кожны кут.

**Настаўнік.** Дзякуй за працу фалькларыстам, можа, ёсць пытанні ў нашых карэспандэнтаў?

***Карэспандэнты.*** Паважаныя фалькларысты, колькі легенд вам удалося запісаць? Гутарка з якім чалавекам вам запомнілася больш за ўсе?

***Настаўнік.*** Наш родны край – гэта людзі: і тыя, з якімі ты ступіў у жыццё, якія заўсёды гатовы прыйсці табе на дапамогу, і тыя, імёны якіх дайшлі да нас праз стагоддзі, якія жылі, змагаліся і марылі пра тое, каб наша Радзіма займала пачэснае месца сярод іншых краін свету. Пра такога чалавека і раскажа нам група даследчыкаў. А пра каго – уважліва слухайце.

***Даследчыкі.*** Працуючы з архіўнымі дакументамі школьнага і раённага краязнаўчага музея, мы даведаліся, што палітычны і грамадскі дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, асветнік на Беларусі і ў Літве Антоній Тызенгаўз нарадзіўся на Гродзеншчыне.

Ёсць меркаванне вучоных, а таксама паводле звестак Беларускай Савецкай Энцыклапедыі ў 16 томе 2003 года выдання на старонцы 72 адзначана, што граф Антоній Тызенгаўз нарадзіўся ў мястэчку Наваельня Навагрудскага павета, якое знаходзілася ў складзе Рэчы Паспалітай у 1733 годзе.

У 1641 годзе прадзед Антонія Стэфан Тызенгаўз, навагрудскі ваявода, атрымаў маёнтак Навельня ў падарунак за добрую службу.

Пасля маёнтак перайшоў у спадчыну да сына Міхаіла. Тызенгаўзы вельмі любілі бываць тут, у маляўнічым кутку на сутыку рэчак Маўчадкі і Ятранкі. Затым маёнтак перайшоў да сына Бенідзікта, бацькі Антонія. Ёсць звесткі, што ў Навельні быў драўляны касцел, у якім і хрысцілі Антонія.

Нас вельмі гэта зацікавіла, і мы вырашылі правесці даследаванне і больш даведацца пра яго жыццё і грамадскую дзейнасць.

А. Тызенгаўз паходзіў са знакамітага нямецкага роду фон Тызенгаўзаў. Далёкія продкі Антонія з'явіліся на зямлі Вялікага Княства Літоўскага яшчэ ў пачатку 13 стагоддзя.

Адукацыю маленькі Антоній атрымаў хатнюю. Настаўнікам манахам-іезуетам не прыйшлося прывіваць любоў да навук, ён адчуваў і разумеў іх душой. Першым звярнуў увагу на яго талент стараста Гродна Юзеф Масальскі. Па яго рэкамендацыі ў 1757 годзе Антоній становіцца гродзенскім падстарастам, а затым пісарам Вялікага Княства Літоўскага. Праз гэту пасаду праходзілі ўсе вялікія дзяржаўныя дзеячы.

У 1765 па даручэнні караля Аўгуста ен прыняў кіраўніцтва каралеўскімі эканоміямі на тэрыторыі Беларусі і Літвы.

Як гродзенскі стараста вырашыў упарадкаваць Гродна на ўзор сталіцы дзяржавы. Ен набыў вядомасць і славу самага знакамітага рэфарматара 18 стагоддзя. Рэч Паспалітая ў гэты час перажывала ўпадак, а А. Тызенгаўз як высокаадукаваны чалавек, выкарыстаў свае веды і энергію для спраў на карысць Айчыны.

Ён зацікавіў караля С. Аўгуста планамі па вываду краіны з крызісу. За 2 дзясяткі гадоў вялікі рэфарматар змог дабіцца пэўных вынікаў у развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі, культуры і аховы здароўя.

Шырокую вядомасць за межамі дзяржавы пры Тызенгаўзе набыло Гродна.

Па яго ініцыятыве ў 1760-80гг. побач з горадам у весцы Гарадніца быў пабудаваны прамыслова-культурны цэнтр з 85 будынкаў рознага прызначэння. У прадмесцях Гродна былі заснаваны і дзейнічалі фабрыкі: суконная, шаўковая, палатняная, панчошная, капялюшная і інш., а таксама завод жалезных і медных вырабаў.

Нас вельмі зацікавіла культурная вобласць дзейнасці рэфарматара. Антоній Тызенгаўз стварыў свой тэатр, у які запрашаў балетмайстараў, замежных артыстаў, музыкантаў, спевакоў і харэографаў. Навучэнцамі ў тэатральную школу найчасцей бралі дзяцей прыгонных сялян. Там вучні набывалі акцёрскія навыкі, вучыліся іграць на музычных інструментах, у праграму заняткаў уваходзілі танец, спевы, нотная грамата. Вучні тэатральнай школы выступалі ў спектаклях тэатра.

У 1775годзе набыў у Вільні друкарню, у якой выдаваліся падручнікі, календары. А ў 1776 годзе арганізаваў першую друкарню ў Гродне.

Тызенгаўз уражваў усіх сваёй велічнасцю і значнасцю, ен быў папулярны ў краіне, як не хто іншы. Канкурэнцыю яму мог скласці толькі князь Кароль Радзівіл.

Вось толькі невялікая частка нашага даследвання. У будучым мы будзем працягваць працу над гэтай тэмай.

***Карэспандэнты.*** Скажыце, калі ласка, у якім кірунку вы далей будзеце працаваць? Дзе плануеце прадставіць вынікі сваей працы?

***Настаўнік.*** Паведамленне групы даследчыкаў даказала, што славу краіне прыносяць таленавітыя людзі. Ці згодны вы, што імёны такіх людзей трэба ведаць і шанаваць?

***Падрыхтаваны вучань чытае.*** Віктар Шымук, вядомы беларускі паэт, які нарадзіўся на Дзятлаўшчыне, пісаў:

Я табе яшчэ раз,
Нібы сын, да зямлі пакланюся.
Я вітаю цябе,
Дарагі мой і мілы куток:
Невялікая станцыя
Роднай маёй Беларусі –
Наваельня,
Зялёны, лясны гарадок.

***Настаўнік.*** Ведаеце, рабяты, нездарма прачытаны вам гэтыя радкі. Менавіта імі пачыналася наша экскурсія па пасёлку, якую нам дапамаглі правесці экскурсаводы школьнага музея, а стварыць відэаэкскурсію – нашы краяведы. Дзякуючы гэтай экскурсіі, мы яшчэ раз упэўніліся, што наш родны край мае багатую гісторыю. Нагадаем, як гэта было.

***Прагляд фрагментаў экскурсіі.***

***Настаўнік.*** Група краяведаў падрыхтавала для вас цікавыя заданні па экскурсіі. Калі ласка, паслухаем іх.

***Краяведы***. Наш конкурс называецца «Знайдзі аб’ект». Мы прапануем вам заданні, якія вы можаце абмеркаць у групах, а затым знайсці неабходны аб’ект на інтэрактыўнай дошцы, размясціўшы яго на карце.

*Пытанні надрукаваны на каляровай паперы і размешчаны на дошцы.*

1. На гэтым месцы ў часы польскай акупацыі знаходзіўся кірмаш, пасля вайны – стадыён, а з 1966 года тут знаходзіцца дзяржаўная ўстанова. Назавіце і пакажыце яе. *(Наваельнянская сярэдняя школа, якая знаходзіцца па вуліцы Снітко.)*
2. Гэты калектыў вядомы далека за межамі Беларусі, дзякуючы сваім творчым поспехам. Знайдзіце будынак, у якім працуе калектыў і назавіце яго. *(Калектыў – дзіцячы духавы аркестр «Наваяльнянскія трубачы», а будынак, у якім вядуцца заняткі, знаходзіцца па в.Снітко.*)

*3.* У гэтым будынку за 5 дзён да пачатку Вялікай Айчыннай вайны размяшчаўся Міжнародны піянерскі лагер – Беларускі Артэк. Пакажыце яго месцазнаходжанне на карце *(Наваельнянская гарпасялковая бальніца знаходзіцца на вуліцы Школьная.)*

*4.* На гэтым месцы зараз знаходзіцца помнік, дзе ў часы Вялікай Айчыннай вайны было расстраляна больш за 850 чалавек яўрэйскай нацыянальнасці. Укажыце гэтае месца і назву помніка. *(Мемарыяльны знак ахвярам Халакоста.)*

5. Каму належаць наступныя радкі верша:

*Новоельня под крыльями.*
*Нет в них святости, нет и греха*
*Между ними небесная просинь*
*И к молитве она не глуха.*

Укажыце вуліцу, дзе пражываў паэт. (*Радкі належаць Яўгенію Матвееву, які жыў на вуліцы Лясная.)*

6. Гэты помнік архітэктуры быў пабудаваны на сродкі прыхажан і апошняга ўладальніка маёнтка Уладзіміра Амбразанцава. Што гэта за помнік і дзе ён знаходзіцца? (*Гэта храм Нараджэння Прэсвятой Багародзіцы, знаходзіцца ён на Наваельнянскай плошчы*.)

***Настаўнік.*** Наша справаздача заканчваецца. Гэты праект – частка працы кожнага з вас. Вы максімальна выкарысталі свае творчыя здольнасці і намаганні. Ёсць у нас і вынік праекта – матэрыял, які можна выкарыстаць як на ўроках, так і на класных гадзінах. Вынікам нашай работы па праекту «Вывучаем родны край» стала і стварэнне віртуальнай кнігі «Летапіс паселка Наваельня» . А рэпартаж з нашай справаздачы карэспандэнты размесцяць на сайце школы.

Бясследна нішто не міне,
Гісторыя слова адродзіць.
Ты – мост, па якім да мяне
Мінуўшчына ў госці прыходзіць.
Мільгаюць старонкі твае –
І мы размаўляем з вякамі,
Продак да нас дастае
Радкамі, нібыта рукамі.

**Рэфлексія**

***Настаўнік.*** Мы сёння яшчэ раз з вамі пераканаліся, штожывём у цудоўным, непаўторным, багатым на гістарычныя падзеі пасёлку Наваельня. Калі, рабяты, я думаю пра родны край, то мне ўспамінаецца

прыгожая рачулка каля маёй хаты, і шмат бяроз цераз дарогу. А вы? Закончыце фразу:

«**Калі я думаю пра свой родны край…**»:

1 група: Я бачу… –

2 група: Я чую… –

3 група: Я адчуваю –

***Настаўнік звяртаецца да дрэва памяці***

***Настаўнік***. *У падзеях мінулага – нашы карані. А дрэва без карэння не можа ні існаваць, ні тым больш прыносіць плады.* Як дрэва не можа жыць без кораня, так і чалавек без памяці. Давайце на наша дрэва наклеім далоні, і гэта будзе сведчыць, што мы заўсёды будзем памятлівы, цікаўнымі, удзячнымі сваім продкам.